**Л.Я. Клімуць**
*(Магілёў)*

# ПАЛІТЫЧНАЯ СВЯДОМАСЦЬ ШЛЯХТЫ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ЯК ЛЮСТЭРКА САРМАЦКАЙ ІДЭАЛОГІІ

Спецыфіка палітычнага ладу Рэчы Паспалітай спрыяла фарміраванню сармацкага аблічча дзяржаўнай ідэалогіі. У Кароне Польскай і Вялікім княстве Літоўскім не склалася абсалютысцкіх манархій, характэрных для шэрага вядучых краін Еўропы. Каралеўская палітыка спрыяла ўзмацненню шляхты ў эканамічным і палітычным сэнсе. Выключнае значэнне шляхты ў справе абароны дзяржавы (яна не толькі служыла ў паспалітым рушэнні, але і давала згоду на падаткі для ўтрымання наёмнікаў) дазваляла ёй уздзейнічаць на караля, улада якога да таго ж слабела ў выніку выбарнага характару манархіі.

Ужо пасля смерці апошняга Ягелона ў асяроддзі ВКЛ выказваліся думкі пра тое, што манарх мае пэўныя абавязкі перад дзяржавай, што існуе своеасаблівы ідэал правіцеля і грамадства ў асобе палітычнага народа (шляхты), які можа і павінен прад'яўляць прэтэндэнту на каралеўскі трон адпаведныя патрабаванні. Падобнымі ідэямі прасякнута выступленне пасла ад Ашмянскага павета, вядомага мысліцеля Андрэя Воляна на элекцыйным сейме 1573 г. У выступленні Воляна знаходзяць сваё адлюстраванне, з аднаго боку, ідэі Рэнесансу і антычных аўтараў [6, с. 173], з другога – тыя пастулаты, якія ў далейшым сталі трывалай часткай сармацкай ідэалогіі.

Пасля абрання Генрыха Валуа ў 1573 г. была складзена pacta conventa, якая значна абмяжоўвала ўладу караля і гарантавала свабоду і прывілеі яго падданым [13]. Захаванне правоў шляхты стала разглядацца як аснова дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай, а шляхта, абараняючы свае інтарэсы, выступала як гарант яго недатыкальнасці. Гэта павінна было пераканаць прадстаўнікоў пануючага саслоўя РП у іх выключнасці, нават пэўнай місійнасці, што з'яўлялася важнай рысай сармацкай ідэалогіі. З гэтага часу і да падзелаў Рэчы Паспалітай адбітак гэтай ідэалогіі можна выразна прасачыць ва ўсёй палітычнай дзейнасці вышэйшых слаёў дзяржавы.

Спроба спыніць аслабленне каралеўскай улады была прадпрынята пры Жыгімонце III Вазе, што адразу ж выклікала супрацьдзеянне шляхты ў выглядзе т. зв. Сандомерскай канфедэрацыі, ці "рокаша Зэбжыдоўскага" (1606 – 1609).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У ВКЛ яго ўзначаліў падчашы вялікі літоўскі Януш Радзівіл. Гэта было, бадай, першае ў гісторыі Рэчы Паспалітай выступленне супраць ідэі парушэння Генрыкавых артыкулаў.

У часы Жыгімонта III упершыню праявіўся знешнепалітычны феномен шляхецкага сарматызму. Ініцыятыва караля ў правядзенні актыўнай знешняй палітыкі не знаходзіла падтрымкі з боку шляхты, якая асцерагалася празмернага ўмацавання манархіі і парушэння ўладнага балансу.

Расчараванне ў рэалізацыі знешнепалітычных амбіцый чакала і сына Жыгімонта III Уладзіслава IV. Пад уражаннем ад поспехаў у канфліктах з Турцыяй Уладзіслаў у саюзе з Венецыяй і Рымам збіраўся нанесці ёй рашучае паражэнне, для чаго планаваў павялічыць колькасць рэестравых казакаў [4]. Аднак шляхта ўбачыла ў планах караля пагрозу сваім вольнасцям, тым больш што гэтаму спадарожнічала ўмацаванне "хлопскага" запарожскага войска, і на сейме 1646 г. прымусіла Уладзіслава публічна адмовіцца ад задумы, якая, у выніку ўдачы, забяспечыла б спакой усім паўднёвым землям Рэчы Паспалітай. Пры Уладзіславе каралеўская ўлада была яшчэ больш абмежавана.

Чарада ваенных канфліктаў, у якую Рэч Паспалітая была ўцягнута ў часы праўлення дынастыі Вазаў, цягнулася да пачатку XVIII ст. Цяжкія ваенныя выпрабаванні абвастрылі шляхецкі "пацыфізм" да крайнасці [14, с. 168]. З другога боку, здольнасць, хоць і не без страт, выстаяць перад шматлікімі ворагамі, яшчэ больш умацавала перакананне шляхты ў сваёй значнасці. Таму чарговая спроба ўмацавання каралеўскай улады, на гэты раз прадстаўніком саксонскай дынастыі Веценаў Аўгустам II, прывяла да паўстання шляхты і абмежавання на "Нямым" сейме 1717 г. дзяржаўнага войска да 18 тыс. у Кароне і 6 тыс. у ВКЛ. Шляхта супраціўлялася павелічэнню войска не толькі з-за нежадання вялікіх выдаткаў, але і дзеля пераканання, што слабасць дзяржавы гарантуе яе існаванне, таму што слабая Рэч Паспалітая нікому не перашкаджае і нікому не пагражае [16]. З-за такіх перакананні, лагічных з пункту гледжання сармацкіх каштоўнасцей, дзяржава апынулася ў бездані анархіі. Менавіта ў гэты час на першы план у палітычным жыцці ўсё больш выходзяць ахоўныя і кансерватыўныя функцыі сарматызму, якія на практыцы прывялі да яго адмоўнага ўздзеяння на палітычнае жыццё дзяржавы.

Гаворачы пра тое, што шляхта кантралявала палітычнае жыццё Рэчы Паспалітай, неабходна адзначыць своеасаблівую прыроду гэтага кантролю. Гэта не была тыповая алігархія з выпрацаваным падзелам улады, а зменлівая група "фамілій", якія канкурыравалі паміж сабой і змянялі адна адну на палітычнай арэне.

У сярэдзіне XVII – XVIII ст. улада ў Рэчы Паспалітай належала вельмі абмежаванаму колу эліты, якая трымала ў сваіх руках усе галоўныя дзяржаўныя пасады і дзякуючы гэтаму змагла сфарміраваць сваю сістэму клііентэль, заснаваную на ўзаемных паслугах. Сістэма кліентэль арганічна ўпісвалася ў мадэль сармацкага грамадства. Адносіны "патрон – кліент" у гэтай сістэме засноўваліся на ідэі шляхецкага братэрства. Таму ў вачах шляхты быць кліентам не было ганебным; наадварот, гэта была прамая магчымасць удзельнічаць у прыняцці палітычных рашэнняў (на сеймах), а значыць, рэалізоўваць сваё саслоўнае, грамадскае і дзяржаўнае права.

Рытуалы і сімвалы сарматызму актыўна выкарыстоўваліся палітычнай элітай і служылі сродкам ідэалагічнага аб'яднання шляхецкіх слаёў. Сармацкая палітычная культура падкрэслівала ідэю свабоды і роўнасці незалежна ад багацця і становішча сям'і. Гэта не адпавядала тагачаснай рэальнасці, але натхняла сярэднюю і дробную шляхту і надавала ім годнасць, якая дазваляла ім успрымаць сябе не як кліента-слугу, а як кліента-сябра. Такая рыторыка палягчала магнатам выкарыстанне шляхты ў сваіх мэтах, а для шляхты з'яўлялася доказам шляхецкага братэрства, якое яны ставілі вышэй за інтарэсы дзяржавы.

Шляхта ідэалізавала дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай, які яна параўноўвала з рэспубліканскім Рымам. У XVII ст. выказваліся думкі, што ён быў непасрэдна створаны Богам [16]. З гэтага пункту гледжання шляхце бачыліся асвечаныя часам правы і звычаі як недатыкальныя, а частая абарона дзяржавы ад іншаземных захопнікаў прыводзіла да замкнёнасці ўнутры сваёй ідэалагічнай сістэмы і ўспрыняцця яе як адзінай стабільнай рэчы, якая для іх з'яўлялася асновай шляхецкай дзяржавы.

Упартай барацьбой суправаджаліся выбары кожнага новага караля. Групоўкі, якія падтрымоўвалі таго ці іншага кандыдата, хоць і змагаліся за ўплыў сваёй фракцыі пры будучым каралі, у той жа час разглядалі гэту барацьбу як абарону свайго права выбраць валадара. Па сармацкай тэорыі, узвядзенне караля на трон разглядалася як дагавор унутры шляхецкага саслоўя, як зносіны роўных з роўным, таму кожная фракцыя мела права выступіць супраць кандыдата, які яе не задавальняў. Распаўсюджванню ідэалогіі сарматызму сярод шляхты ВКЛ спрыяў актыўны ўдзел яе вярхоў у палітычным жыцці Рэчы Паспалітай і аўтарытэт, які мелі магнаты ВКЛ сярод сваіх польскіх саюзнікаў. Разуменне сваёй важнасці ў агульнай дзяржаве і павагі з боку палякаў спрыялі паступоваму выхаду на першы план ідэі агульнага паходжання ад сарматаў і адсоўванне легенды пра рымскае паходжанне беларускай і літоўскай шляхты.

Важным сродкам праяўлення палітычнай актыўнасці шляхты быў удзел у сеймах, куды шляхта накіроўвала сваіх дэпутатаў. Шляхта разглядала свой удзел у Радзе і Сенаце не як міласць з боку караля ці вялікага князя, а як сваё законнае права. Аднак гэтым удзел шляхты ў кіраванні дзяржавай не абмяжоўваўся. У канцы XVI – пачатку XVII ст. цяжар палітычнага жыцця пераносіцца з цэнтра ў паветы, дзе на мясцовых сейміках шляхта жыва вырашала пытанні, якія тычыліся агульнадзяржаўных спраў, і часам прымала рашэнні, якія супярэчылі пастановам цэнтральных органаў. У палітычнай ідэалогіі сарматызму правінцыя набывае асаблівае значэнне. Вёска была натуральным асяродкам жыцця шляхціца, а кожны палац і нават двор уяўляў сабою замкнёную адзінку, якая ўспрымала спробу любых змен з боку цэнтральнай улады як пагрозу самому яе існаванню. У тэстаментах сярэдняй і дробнай шляхты, у якіх, між іншым, вызначалася месца пахавання, яскрава чытаецца ідэя прывязанасці да зямлі і роду нават пасля смерці.

Такое ўспрыняцце, з аднаго боку, засноўвалася на ідэі шляхецкай роўнасці, а з другога, вяло да ўзрастання мясцовых сеймікаў у палітычным жыцці дзяржавы як голасу шляхецкага брацтва [28, с. 135]. Гісторыкі ў адносінах да гэтых працэсаў выкарыстоўваюць тэрмін "дэцэнтралізацыя ўлады", таму што найважнейшыя рашэнні фактычна прымаліся на мясцовым узроўні. Гэта дэцэнтралізацыя выходзіла з самой сутнасці сармацкай ідэалогіі, для якой характэрна не дзяржаўнае мысленне, а партыкулярызм у палітычных поглядах і якая вышэй дабрабыту дзяржавы ставіць правы яе грамадзяніна (маючы на ўвазе шляхціца). Нездарма адной з галоўных рысаў ідэальнага манарха шляхта лічыла абарону шляхецкіх правоў і вольнасцей.

Дзяржаўныя інстытуты ў вачах сарматаў служылі для таго, каб сачыць за дзеяннямі караля і не дапускаць злоўжыванняў на шкоду шляхце, і ліберум вета – для абмежавання цэнтралізатарскіх памкненняў караля і карупцыі пры каралеўскім двары.

Шляхта часта ўспрымала палітычныя ініцыятывы караля як яго імкненне атрымаць асабістую ўладу. Гэта разглядалася як ігнараванне палітычных правоў шляхты, у прыватнасці, яе права вырашаць лёс краіны, які яна лічыла не проста традыцыйным законным правам, але і свяшчэнным абавязкам. У выпадку рокашаў галоўную ролю адыгрывала, як правіла, абурэнне шляхты тымі ці іншымі дзеяннямі манарха, а эмоцыі не дазвалялі ёй спакойна аналізаваць сітуацыю. У такой атмасферы ідэі дабра для дзяржавы адыходзілі на другі план, саступаючы месца закансерваваным уяўленням.

Відавочна, што гэта ідэалогія моцна разыходзілася з рэальнасцю і ў інтэрпрэтацыі шляхты мела моцныя супярэчнасці. Яна праслаўляла рыцарскія здольнасці тады, калі ўсё больш адстойвала сваё права на мірнае жыццё ў вёсцы, а ўхваляла рэспубліканізм і супраціўлялася пагрозе з боку манархічнай улады, калі трон займалі самыя слабыя ў гісторыі манархі. Такі падыход абмяжоўваў магчымасці шляхты ўбачыць рэальную карціну і тую небяспеку, у якой знаходзілася дзяржава.

Сармацкае мысленне паўплывала і на адносіны шляхты да наёмнай арміі. На сеймах шляхта прымала меры,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

каб захаваць армію ў невялікай колькасці, нават у крытычныя для краіны часы [24, с. 189]. Гэта тлумачыцца іх упартай падтрымкай традыцыі, якая вымагала ад шляхты абароны краіны; гэту традыцыю яны разглядалі як свой ганаровы абавязак і, адпаведна, нікому не маглі яго саступіць.

Шляхта часта не зважала на палітычныя праблемы дзяржавы, калі справа даходзіла да захавання традыцыйных устанаўленняў і ладу жыцця, як яны іх сабе ўяўлялі.

У канцы XVIII ст. на палітычнай арэне можна вылучыць два лагеры: сацыяльна аднародная і еўрапеізаваная ў культурным сэнсе шляхта, накіраваная на рэформы, і прыхільнікі сармацкай палітычнай і культурнай традыцыі, раздзеленыя ўнутры на фракцыі, якія змагаліся і з супрацьлеглым лагерам, і паміж сабою.

Немалаважны і той факт, што ў лагеры рэфарматараў канца XVIII ст. было многа прадстаўнікоў тых сем'яў, якія толькі нядаўна ўзвысіліся ў палітычных адносінах (Агінскія, Чартарыйскія). У значнай ступені барацьба за Канстытуцыю 1791 г. была не толькі барацьбой за выратаванне дзяржавы, але і за атрыманне палітычнага кантролю ў краіне і перамогі над пануючымі кланамі.

Упартае імкненне захаваць дзяржаву ў якасці сармацкага бастыёну прыводзіла да таго, што шляхта сама запрашала чужынцаў. Сарматызм, які пачынаўся як ідэалогія высокага становішча шляхты ў грамадстве і барацьбы з замежнымі ворагамі, перараджаецца ў анахранічную сістэму, якая ў бедах Рэчы Паспалітай вінаваціць замежныя ўплывы, але, як гэта ні парадаксальна, на выратаванне заклікае суседнія дзяржавы. Дэмакратыя ў сармацкім разуменні на самай справе аказалася анархіяй.

Такім чынам, палітычнае жыццё як Рэчы Паспалітай, так і ВКЛ як яе часткі было звязана з сармацкім характарам ідэалогіі. Павага да традыцый сарматызму і ўтрыманне гэтых традыцый для шляхты былі важней, чым практычныя патрэбы дзяржавы. Імкненне захаваць шляхецкія традыцыі, якія ішлі з глыбіні вякоў і прынеслі ім славу, перамагло неабходнасць захавання той самай дзяржавы, для славы якой яны свае ўчынкі і здзяйснялі.

## Літаратура


1. Історія українського війська. Ч. II. Запорозьке Військо [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://exlibris.org.ua/wijsko/r206.html. – Дата доступу: 14.12.2007.
2. Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын – Мінск: Бел. навука, 2003. – 316 с.
3. Articuli Pactorum Conventorum... parte ab altera // Volumina Legum: in 10 t. – Petersburg, 1859. – T. 2. – S. 133-134.
4. Baranowski, B. Znajomość Wschodu w dawnej Polsce do połowy XVIII wieku / B.Baranowski. – Łódź: Łódzkie Towarzystwo Naukowe, 1950. – 256 s.
5. Kądziela, Ł. Sarmatyzm / Ł. Kądziela // Wiedza i Zycie, nr 5/1996 [Electronic resource]. – 1996 – 2007. Mode of access: http: // archiwum. wiz. Pl /1996 /96053700.asp. – Date of access: 24.02.2007.
6. Rzeczpospolita szlachecka: 1586-1795 / Marek Derwich (red.) [et al.]. – Warszawa: Horyzont ; Wrocław: Wydaw. Dolnośląskie, 2003. – 264 s.
7. Zakrzewski, A. Sejmiki Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI – XVIII w. – ustrój i funkcjonowanie: sejmik trocki / A. Zakrzewski. – Warszawa: Liber, 2000. – 257 s.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова